**А. Іваноўская**

# АЛАІЗА ПАШКЕВІЧ – АСОБА БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

Алаіза Пашкевіч, найбольш вядомая пад ласкавым «Цётка», пакінула значны след у гісторыі нашай краіны не толькі сваімі вершамі, але і бурнай грамадскай дзейнасцю. Яна паэтка, пісьменніца, публіцыстка, актрыса, настаўніца і нават сястра міласэрнасці. Яна – сапраўдная рэвалюцыянерка, бо ўвасобіла ў сабе амаль што ўсе рысы рэвалюцыянера-барацьбіта таго часу: сумленнасць, вострае адчуванне сацыяльнай крыўды і несправядлівасці, вера ў высокую ідэю, у той жа час – жорсткасць да ворагаў гэтай ідэі.

Канец XIX – пачатак XX ст. у гісторыі Беларусі – гэта перыяд паступовага адраджэння нацыянальнай свядомасці, перыяд значнага ўздыму літаратурна-грамадскага руху. Сярод значных падзей, у цеснай сувязі з якімі развіваўся нацыянальны рух, – рэвалюцыі 1905–1907 і 1917 гадоў, Першая сусветная вайна. Безумоўна, такія значныя для грамадства падзеі не маглі не закрануть Алаізу, не паўплываць на яе светапогляд.

Першыя крокі ў рэвалюцыйнай дзейнасці Алаіза Пашкевіч пачала рабіць у 1902 годзе ў Санкт-Пецярбурзе. Яна далучылася да гуртка студэнтаў «Круг беларускай народнай прасветы», дзе прымала актыўны ўдзел у выдавецкай і прапагандысцкай дзейнасці. Творчасць Цёткі прадстаўлена паэзіяй, прозай і публіцыстыкай. Вершы «Мора», «Хрэст на свабоду», «Вера беларуса» ў той час гучалі як пракламацыі, з якімі яна выступала на мітынгах і сходах. Цётка мела непасрэднае дачыненне да беларускіх выдавецкіх суполак, фактычна была рэдактарам часопіса для моладзі «Лучынка». У публіцыстычных выступленнях яна ўздымала актуальныя для яе сучаснікаў пытанні, напрыклад, неабходнасць адукацыі на роднай мове. Таксама Цётка з'яўляецца аўтарам зборніка «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Частка матэрыялаў з кніжкі – гэта апрацоўка пісьменніцай народнай творчасці і адаптацыя фальклору да дзіцячага ўзросту. На пачатку XX ст. Цётка была першай сярод беларускіх пісьменнікаў у справе складання кніжак для дзяцей, таму мы можам смела сцвярджаць, што яна заклала асновы асветніцкай беларускай методыкі. Алаізу Пашкевіч можна лічыць палітычнай дзяячкай. Яна была сябрам першай беларускай рэвалюцыйнай партыі Беларуская рэвалюцыйная грамада, арганізоўвала рабочыя гурткі, а ў 1905 г. як дэлегат ад беларускіх жанчын прымала ўдзел у жаночым з'ездзе ў Маскве. У 1915 г., на пачатку

Першай сусветнай вайны, грамадская дзейнасць Алаізы Пашкевіч была цесна звязана з Беларускім таварыствам дапамогі ахвярам вайны ў Вільні: яна даглядала хворых, дапамагала ў арганізацыі дзіцячых прытулкаў.

Такі жаночы геній, як Алаіза Пашкевіч, – вялікая рэдкасць і вялікая каштоўнасць для айчыннай гісторыі. На свае плечы Цётка паклала крыж міласэрнасці і пранесла яго самаахвярна, аддана і годна да самай апошняй хвіліны.